# СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

## Сінтаксічныя адзінкі – словазлучэнне, сказ, тэкст

### Разбор словазлучэння

×┌што?┐

Галоўнае слова + залежнае слова: ***пішу пісьмо*** -- **1) дзеяслоўнае;**

(дз.) (н.) **2) дзеянне і яго прадмет;**

**3) аб’ектнае;**

┌ які? ┐ × **4) кіраванне.**

***Высокі падмурак*** -- **1) назоўнікавае;**

(прым.) (н.) **2) прадмет і яго прымета;**

**3) азначальнае;**

**4) дапасаванне.**




### Галоўныя члены сказа

**Дзейнік** **(хто? што?):** *Ракоча* (што?) ***прыбой*** *і не ведае зморы.*
*Усе* (хто?) ***рабочыя*** *ўсталі з месца.*

**Выказнік** **(што робіць прадмет?):** *Ввечарам мы* (што зрабілі?) ***сабраліся*** *ў школьным будынку.*
**(які прадмет?):** *Беларусь мая* (якая?) ***сінявокая***.
**(што ён такое?):** *Мінск* –(што ён такое?) ***сталіца*** *Беларусі.*

### Даданыя члены сказа

| **Дапаўненне** | **Азначэнне** | **Акалічнасць** |
|---|---|---|
| Н. – | **(**які? чый?) | дзе? куды? адкуль? |
| Р. (каго**?** чаго?) | (якога? чыйго?) | як? калі? наколькі? |
| Д. (каму? чаму?) | (якому? чыйму?) | чаму? навошта? |
| В. (каго? што?) | (якога? чыйго?) | па якой прычыне? |
| Т. (кім? чым?) | (якім? чым?) | з якой мэтай? |
| М. (аб кім? аб чым?) | (аб якім? аб чыім?) | нягледзячы на што? |

## **Узор сінтаксічнага разбору простага сказа (5 кл.)**

*Цёплая летняя ноч павольна апускалася на зямлю і ўсё гусцей церушыла над ёю.*

1. Апавядальны.
2. Няклічны.
3. Граматычная аснова:
*ноч* – дзейнік, выражаны назоўнікам;
*апускалася, церушыла* – аднародныя выказнікі, выражаныя дзеясловамі.
4. Развіты:
*цёплая, летняя* – азначэнні, выражаныя прыметнікамі;
*павольна* – акалічнасць, выражаная прыслоўем;
*на зямлю* – акалічнасць, выражаная назоўнікам з прыназоўнікам;
*гусцей* – акалічнасць, выражаная прыслоўем;
*над ёю* – дапаўненне, выражанае займеннікам з прыназоўнікам.
5. Ускладнены аднароднымі выказнікамі.

## **Узор сінтаксічнага разбору простага сказа (9 кл.)**

*За два гады наступлення мы ўсе, спакутаваныя ў крывавых баях, пэўна, адспавядаліся адзін перад другім душой.*

1. Апавядальны.
2. Няклічны.
3. Двухсастаўны.
4. Поўны.
5. Граматычная аснова:
*мы* – дзейнік, выражаны назоўнікам;
*адспавядаліся* – просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам.
6. Развіты:
*за два гады* – акалічнасць часу, выражаная колькасна-іменным словазлучэннем;
*наступлення* – ускоснае дапаўненне, выражанае назоўнікам;
*усе* – дапасаванае азначэнне, выражанае займеннікам;
*спакутаваныя ў крывавых баях* – дапасаванае адасобленае азначэнне, выражанае дзеепрыметным зваротам;
*адзін перад другім* – акалічнасць спосабу дзеяння, выражаная непадзельным словазлучэннем;
*душой* – ускоснае дапаўненне, выражанае назоўнікам.
7. Ускладнены адасобленым азначэннем, пабочнай канструкцыяй.